З першых вуснаў

# «САМАЕ ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ МЯНЕ — РЭЗЕРВОВАЯ ВАЛЮТА»

**Рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся з глабальных пытанняў фінансавай сферы і ўзаемадзеяння ў банкаўскім сектары Беларусі і Расіі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком Цэнтрабанка Расіі Эльвірай Набіулінай.**

«Хацеў бы чаму-небудзь «падвучыцца», задаць шэраг пытанняў, якія сёння на вуснах у многіх кіраўнікоў дзяржаў. Вы бачыце гэта ў нашых выступленнях. Напэўна, мы многае гаворым, але калі і разумеем сёе-тое (тыпу рэзервовая валюта і гэтак далей), не зусім разумеем, калі гэта будзе і як гэта будзе развівацца. Таму такія пытанні мяне больш за ўсё цікавяць. Ваш пункт гледжання, пункт гледжання вашых спецыялістаў», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што да дзейнасці Міжбанкаўскага валютнага савета (Цэнтральнага банка Расіі і Нацыянальнага банка Беларусі) пытанняў няма. «Я часта прыводжу вашы цытаты, нашага старшыні на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, калі гаворка ідзе аб стварэнні адзінай валюты і гэтак далей, што гэта не просты працэс. І, мабыць, не сённяшняга дня, як мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі. Але, тым не менш, некаторыя «патрыятычна настроеныя» людзі ў Расіі і тут, у Беларусі, часта ўзнімаюць гэтае пытанне. Я хацеў бы пачуць ваш пункт гледжання на сённяшні дзень. Той даўні пункт гледжання я добра ведаю», — сказаў ён.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што кіраўнік Цэнтрабанка Расіі — дзейная фігура: «Нават нашы ворагі прызнаюць, што Эльвіра Набіуліна вельмі хутка разабралася з пытаннямі эканомікі Расіі і валютнымі праблемамі, асабліва ва ўмовах санкцый. Гэта я амаль працытаваў нашых ворагаў».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў Эльвіру Набіуліну спыніцца на пытанні лічбавага рубля, пра які сёння шмат кажуць. Прэзідэнта цікавіць, як трэба рухацца ў гэтым кірунку. «Але самае галоўнае для мяне — гэта ўсё ж рэзервовая валюта. Дэдаларызацыя міжнароднай эканомікі ідзе, пра гэта і вы казалі. Наколькі гэты працэс глыбока зайшоў? Натуральна, што з'явяцца новыя рэзервовыя валюты, але што па тэрмінах, па хуткасці? Я ўвесь час сваіх калег падштурхоўваю, што трэба бегчы, каб не адстаць. Вось тут бегчы ці ўсё ж гэта доўгі працэс?» — пацікавіўся ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што яго цікавяць тыя праблемы, якімі жывуць сёння Цэнтрабанк Расіі і Нацбанк Беларусі: «І калі ёсць нейкія пытанні, вы скажыце, будзем працаваць над гэтымі пытаннямі, каб іх зняць».

«Мы ж па валютным саюзе (размова аб Міжбанкаўскім валютным савеце Нацыянальнага банка Беларусі і Цэнтральнага банка Расіі) два разы на год сустракаемся. Не толькі ў Мінску, мы сустракаемся ў розных месцах. Абмяркоўваем усе пытанні, тое, аб чым вы сказалі», — адзначыла Эльвіра Набіуліна.

Кіраўнік Цэнтрабанка прыбыла ў Беларусь напярэдадні. Паводле яе слоў, яна была ўражана прыродай і дагледжанасцю краіны.

«Падобна на вашу радзіму (Эльвіра Набіуліна родам з Уфы, сталіцы Башкартастана. — **«Зв.»**). Я заўсёды гавару: лячу на самалёце, падлятаю да вас — адзін у адзін. Адзін у адзін прырода», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Парламенцкі дзённік

# ПЕРСПЕКТЫВЫ — ПА МНОГІХ НАПРАМКАХ

## Парламенцкая дэлегацыя Султаната Аман наведала Савет Рэспублікі

**Прывітаўшы замежных гасцей у верхняй палаце парламента і падзякаваўшы за прынятае запрашэнне пабываць у нашай краіне, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падкрэсліла, што паміж дзвюма дзяржавамі склаліся добрыя і сяброўскія адносіны. Аб гэтым сведчыць і той факт, што летась Беларусь і Султанат Аман адзначылі 30-годдзе дыпламатычных адносін.**

Спікер нагадала, што ў 2007 годзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведваў Султанат Аман з дзяржаўным візітам, а ў 2017 годзе ў гэтай краіне пабываў наш міністр замежных спраў.

Наталля Качанава выказала ўпэўненасць, што візіт парламенцкай дэлегацыі Султаната Аман адкрые новую старонку ў адносінах паміж краінамі і надасць гэтаму супрацоўніцтву яшчэ больш шчыльнае ўзаемадзеянне: і ў гандлёва-эканамічным напрамку, і культурным, і, самае галоўнае, парламенцкім. «У нас ёсць добрыя перспектывы ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, — адзначыла Наталля Качанава. — Пакуль у нас яшчэ вельмі сціплыя вынікі. Але нягледзячы на санкцыйны ціск, які аказваецца на нашу краіну, Беларусь развіваецца паспяхова. Працуюць прадпрыемствы, арганізацыі, установы».

Старшыня Савета Рэспублікі коратка расказала аб Беларусі, дзейнасці ва ўмовах санкцыйнага ціску. Як сёння працуе эканоміка нашай краіны, парламентарыі Амана пераканаюцца на ўласныя вочы: калегі з Беларусі падрыхтавалі для іх насычаную праграму. «Я думаю, што вы для сябе адкрыеце Беларусь, калі вы яшчэ ў нас упершыню», — лічыць Наталля Качанава.

Звярнула ўвагу спікер і на напружаную абстаноўку, якая назіраецца навокал. «У свеце адбываюцца такія падзеі, якія ўплываюць на будучыню не толькі асобна ўзятай краіны, а і ўсяго светаўладкавання, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Як кажа наш Прэзідэнт, ідзе геапалітычны передзел свету, і ў гэтай сітуацыі наш голас, парламентарыяў — дэпутатаў, сенатараў — павінен быць гучнейшы, для таго, каб адстойваць мір, свабоду і суверэнітэт кожнай краіны, якая развіваецца па сваіх законах, традыцыях, зыходзячы з менталітэту людзей, якія жывуць у гэтых краінах». Спікер адзначыла таксама і міралюбівую палітыку нашай дзяржавы.

Член Дзяржаўнага савета Султаната Аман, кіраўнік парламенцкай групы дружбы паміж Султанатам Аман і Рэспублікай Беларусь Сайд Мубарак аль-Мухарамі падкрэсліў, што, акрамя ўмацавання міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, задача аманскіх парламентарыяў і ў пашырэнні гандлёва-эканамічнага, культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі: «Вядома, галоўны прыярытэт — гэта гандлёва-эканамічная сфера. У Рэспубліцы Беларусь шмат інвестыцыйных магчымасцяў, і мы спадзяёмся на прыход агенцтва па інвестыцыях у вашу краіну. Таксама мы запрашаем беларускія дзелавыя колы прыходзіць у свабодныя зоны Султаната Аман. Наш урад прадстаўляе значныя прэферэнцыі для замежнага бізнесу».

Замежныя госці праінфармаваны, што ў Беларусі вельмі развітая сельскагаспадарчая вытворчасць. «Гэта перспектыўная сфера для сумесных праектаў, — перакананы Сайд Мубарак аль-Мухарамі. — Мы таксама зацікаўлены ў супрацоўніцтве ў сферы адукацыі, абмене студэнтамі, выкладчыкамі, сумесных даследаваннях, пашырэнні культурных сувязяў паміж нашымі краінамі, якія дазваляюць уноcіць уклад ва ўзаемапаразуменне паміж нашымі народамі».

Па заканчэнні двухбаковай сустрэчы Сайда Мубарака аль-Мухарамі з Наталляй Качанавай члены рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з Парламентам Султаната Аман абмеркавалі канкрэтныя шляхі далейшага ўзаемадзеяння з парламенцкай дэлегацыяй Амана.

Як заўважыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ,** Султанат Аман з'яўляецца найважнейшай дзяржавай — нашым партнёрам на Блізкім Усходзе. Рынак Амана вельмі патрабавальны, і ўвайсці ў яго каштуе вялікіх намаганняў. «Той максімальны тавараабарот, якога мы дасягнулі, з'яўляецца вынікам вялікай работы нашых прадпрыемстваў. За тры месяцы 2023 года тавараабарот вырас амаль у чатыры разы. Мы традыцыйна на аманскі рынак пастаўляем калійныя ўгнаенні, прадукцыю прамысловай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці», — адзначыў сенатар.

Што датычыцца гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, паміж Беларуссю і Аманам будзе рэалізаваны шэраг праектаў. У прыватнасці, плануецца стварыць сумеснае прадпрыемства па вытворчасці біяўгнаенняў. Прадугледжаны праекты і ў галіне нафтаперапрацоўкі, іншых сферах. «Развіваецца значнае супрацоўніцтва і ў галіне паслуг: гэта і транспартныя паслугі, і медыцынскія, — дадаў Сяргей Рачкоў. — Вельмі перспектыўным з'яўляецца ўзаемадзеянне ў галіне аховы здароўя і медыцыны. У гэтым нашы аманскія сябры таксама зацікаўлены».

**Вераніка КАНЮТА.**

Класныя навіны

# Колькасць стабальнікаў б'е ўсе рэкорды

**482 выпускнікі атрымалі на цэнтралізаваным экзамене па рускай мове 100 балаў, а на ЦЭ па беларускай мове зарэгістравана 413 стабальных вынікаў.**
**Калі ўзяць пад увагу тую акалічнасць, што рускую мову здавалі 41,8 тысячы выпускнікоў, а беларускую — больш за 11,5 тысячы, то атрымліваецца, што з тэстамі па беларускай мове выпускнікі справіліся лепш.**

Першы ў гісторыі беларускай школы цэнтралізаваны экзамен па рускай і беларускай мовах прайшоў у краіне 14 мая. У ім узялі ўдзел больш за 53 тысячы адзінаццацікласнікаў. У Міністэрстве адукацыі такое істотнае павелічэнне колькасці 100-бальных вынікаў у параўнанні з папярэднімі гадамі патлумачылі поўнай карэляцыяй тэставых матэрыялаў з вучэбнай праграмай, а таксама выключэннем з тэстаў заданняў пятага ўзроўню складанасці.

«Каля 10 працэнтаў выпускнікоў не змаглі пацвердзіць школьныя адзнакі «9» і «10» балаў, атрыманыя па выніках года, — паведамілі ў прэс-службе міністэрства. — Пры здачы ЦЭ выпускнікі школ, гімназій і ліцэяў даволі паспяхова справіліся з заданнямі. Вынікі «6», «7» і «8» балаў па дзесяцібальнай шкале паказалі каля 60 % удзельнікаў ЦЭ па дзяржаўных мовах, што ў цэлым супастаўна з вынікамі выніковай атэстацыі за апошнія два гады. У сярэднім навучэнцы справіліся прыкладна з 70 працэнтаў заданняў ад іх агульнай колькасці. Разам з тым ёсць і дастаткова нізкія вынікі. Так, тэст па беларускай мове на «0» балаў выканалі 3 чалавекі. «1» і «2» балы (па дзесяцібальнай шкале) атрымалі 63 навучэнцы па беларускай мове і 85 — па рускай». Улічваючы, што III ступень агульнай сярэдняй адукацыі ў рамках профільнага навучання ў цэлым арыентавана на падрыхтоўку да паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі, трэба больш адказна падыходзіць да прыняцця рашэння аб прадаўжэнні навучання пасля 9 класа, падкрэсліваюць у галоўным адукацыйным ведамстве.

Новая форма выніковай атэстацыі выпускнікоў школ апраўдала сябе — так лічаць у Міністэрстве адукацыі, але дэталёвы аналіз вынікаў ЦЭ будзе прадоўжаны з мэтай удасканалення тэставых матэрыялаў, а таксама работы педагагічнага корпуса.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў пачала працаваць гарачая лінія па пытаннях вынікаў ЦЭ. Тэлефанаваць па нумары 8 (017) 311-00-08 можна штодня з 9.00 да 17.00, перапынак на абед — з 13.00 да 14.00.

«Параўноўваць вынікі, атрыманыя на рэпетыцыйным тэсціраванні, і вынікі ЦЭ некарэктна, — папярэджвае **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый МІКСЮК.** — З любымі пытаннямі трэба звяртацца на нашу гарачую лінію. Пераразліку вынікаў цэнтралізаванага экзамену не будзе. Тыя балы, якія абітурыенты бачаць у асабістым кабінеце на сайце РІКВ, актуальныя і правільныя. Яны і пойдуць у сертыфікат ЦЭ».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Эрдаган перамог у другім туры выбараў прэзідэнта Турцыі



Яго вынік — больш за 52 % галасоў, адрыў ад саперніка, па інфармацыі РІА «Навіны» перавышае два мільёны галасоў. Канчатковыя вынікі выбараў будуць апублікаваны не раней за 1 чэрвеня.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Рэджэпа Таіпа Эрдагана з пераабраннем на пасаду Прэзідэнта Турцыі, паведамляецца на партале беларускага лідара. «Важныя сацыяльна-палітычныя падзеі ў Турцыі супалі з цяжкімі выпрабаваннямі пасля ўдару стыхіі. Але, нягледзячы на гэты выклік, удалося захаваць стабільнасць у грамадстве, для якога Вы робіце ўсё магчымае і нават больш. Лічу Вас годным, моцным палітыкам і добрым сябрам Беларусі. У нас аднолькавыя інтарэсы па дээскалацыі міжнароднай абстаноўкі, забеспячэнні харчовай бяспекі і мірным вырашэнні спрэчак. Можаце на нас заўсёды разлічваць», — гаворыцца ў віншаванні.

Гэта трэці прэзідэнцкі тэрмін Эрдагана, які перамог на першых усенародных выбарах прэзідэнта Турцыі ў 2014 годзе і захаваў за сабой гэтую пасаду па выніках выбараў у 2018-м.

### Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін падпісаў закон аб дэнансацыі Дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе

Дагавор аб звычайных узброеных сілах у Еўропе быў падпісаны ў 1990 годзе і адаптаваны ў 1997 годзе, нагадвае ТАСС. Краіны НАТА не ратыфікавалі адаптаваную версію гэтага дакумента і працягнулі прытрымлівацца палажэнняў 1990 года, у якіх змяшчаюцца нормы звычайных узбраенняў з разліку баланcу паміж НАТА і Арганізацыяй Варшаўскага Дагавора. У выніку Расія была вымушана аб'явіць у 2007 годзе аб мараторыі па выкананні ўмоў пагаднення. 11 сакавіка 2015 года Расія прыпыніла свой удзел у пасяджэннях Сумеснай кансультатыўнай групы па ДЗУСЕ і такім чынам завяршыла працэс прыпынення свайго членства ў дагаворы, але чыста юрыдычна працягвала заставацца ў ім. З гэтага часу інтарэсы РФ у Сумеснай кансультатыўнай групе прадстаўляла Беларусь.

### Лодка з турыстамі перакулілася ў Італіі, чатыры чалавекі загінулі



Агенцтва Ansa паведаміла ў панядзелак, што сярод загінулых — грамадзянка Расіі, астатнія тры ахвяры — ізраільцянін і двое італьянцаў. Трагедыя адбылася ў нядзелю вечарам на італьянскім возеры Маджорэ, калі турысты сяткавалі на лодцы дзень нараджэння. Усяго на борце было 24 чалавекі, усе яны апынуліся ў вадзе, калі лодка перакулілася. Дваццаць чалавек выратаваліся: адны самі дабраліся да берага, другіх падабралі лодкі, якія знаходзіліся на возеры. Пяцёра пасажыраў атрымалі траўмы. Папярэдняя прычына аварыі — раптоўны шторм з моцнымі парывамі ветру і дажджом.